**В. Зубрык**

# ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ БЕЛАРУСІ

ААТ «Шклозавод “Нёман”» знаходзіцца ў месцы з гістарычнай назвай Бярозаўка – горадзе майстроў шкла, традыцыі працы з якім былі закладзены ў пачатку 1880-х гадоў. Працоўны пасёлак майстроў шлкла, а потым горад утварыўся каля заснаванай у Лідскім павеце Віленскай губерні гуты: так заўсёды на нашых землях называлі шкляныя майстэрні.

Пачалося ўсё з таго, што мясцовы памешчык З. А. Ленскі адправіў у Лідскае павятовае паліцэйскае кіраванне ліст наступнага зместу: «Проситель желает устроить в лесной даче имения моего Заенчицы стеклянный завод или «гуту» для выделки стекла и стеклянных посуд, для чего желаю получить разрешение надлежащей власти». Ленскі прадбачыў, што вырабы са шкла будуць добра прадавацца, паколькі ў суседняй Лідзе на той час быў адкрыты броварны завод, якому былі патрэбныя піўныя бутэлькі.

З 1891 г. гута знаходзілася ў арэндзе В. А. Краеўскага і Ю. А. Столле: але іх далей не задавальняла роля простых арандатараў, таму яны будуюць новы шкляны завод.

У 1902 г. старая гута «Нёман-А» зачыняецца; у тым умовах новы завод «Нёман-Б» становіцца галоўным. Назва «Нёман» не выпадкова, бо стаіць завод на беразе Нёмана – самай вядомай ракі ў Беларусі.

У 1905 г. В. Краеўскі трагічна загінуў. Ю. Столле вырашае выплаціць кампенсацыю спадчыннікам Краеўскага дзеля таго, акба стаць поўнаўладным гаспадаром завода.

Менавіта пры кіраўніцтве Ю. Столле шкляная вытворчасць шклозавода «Нёман» дасягнула росквіту, мясяцовага празання і сусветнай славы. Разам

з заводам вакол прадпрыемства вырас і горад Бярозаўка з усёй інфраструктурай. Асартымент прадпрыемства сёння прадстаўлены пяццю тысячамі вырабаў.

Даследаванне гісторыі шклозавода прывяло аўтара да пераканання, што ў горадзе павінен быць помнік чалавеку, які пакінуў след у гісторыі населенага пункта. У любым месцы ёсць свае годныя грамадзяне, вартыя быць увекавечанымі ў граніце ці бронзе.

Лічым, што найбольш удалым месцам для размяшчэння будзе тое, дзе помнік узвысіцца над галоўнай магістраллю горада. Яму лепей стаяць у маляўнічым месцы – парку імя Леніна, дзе адна з алей вядзе да музычнай школы – раней жылога дома Ю. Столле. Постаць дзеяча будзе вельмі натуральная: ён стаіць, заклаўшы адну руку за борт сурдута, а другую – адкінуўшы назад і трымаючы ў ёй капялюш.

Кожны турыст, які будзе прыязджаць на экскурсію на шклозавод, здолее ўбачыць гэты помнік, і, слухаючы ад экскурсавода гісторыю шклозавода (а разам з тым і горада), будзе уяўляць гэтага вялікага чалавека, праславіўшага нашу малую Радзіму ў гісторыі і далёка за яе межамі.